# АНЦІНЕЯ РЫГОРАЎНА МУРАШКА

## (Да 60-годдзя з дня нараджэння)



Сёлета 15 кастрычніка споўнілася 60 гадоў кандыдату філалагічных навук, дацэнту кафедры рускай мовы Анцінеі Рыгораўне Мурашцы.

А. Р. Мурашка нарадзілася ў вёсцы Кірава Слуцкага раёна. Праз тры гады сям'я пераехала ў Мінск. Тут Анцінея Рыгораўна скончыла дзевяць класаў сярэдняй школы. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, разам з піянерскім лагерам была эвакуіравана ў горад Хвалынск Саратаўскай вобласці. Выхоўвалася ў дзіцячым доме. Там жа скончыла дзесяты клас, пасля чаго пачала працаваць зменнай выхавацельніцай у інтэрнаце дзяцей саюза пісьменнікаў у горадзе Чыстопалі Татарскай АССР. Праз два гады паступіла на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, які скончыла ў 1948 годзе. З 1950 па 1963 год працавала ў Інстытуце мовазнаўства АН БССР. У 1958 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю аб формах прыметнікаў у беларускіх гаворках. Па тэме дысертацыі апублікавала шэраг артыкулаў: «Формы меснага склону адзіночнага ліку прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду ў беларускіх гаворках» (1957), «Кароткія формы прыметнікаў у беларускіх гаворках» (1958), «Ступені параўнання якасных прыметнікаў» (1963) і інш. Заслугоўваюць вялікай увагі таксама артыкулы гэтага часу, прысвечаныя розным лексічным і граматычным асаблівасцям беларускіх гаворак, узаемадзеянню беларускай нацыянальнай мовы з яе гаворкамі і гаворкамі суседніх славянскіх і неславянскіх моў.

А. Р. Мурашка з'яўляецца сааўтарам усіх найбольш значных навуковых даследаванняў, якія былі выкананы сектарам дыялекталогіі Інстытута мовазнаўства АН БССР у 50-х гадах. Асабліва многа часу і сіл яна аддала збіранню экспедыцыйным метадам фактычных матэрыялаў і стварэнню на аснове іх такіх грунтоўных прац, як «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963) і «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1969). За гэтыя навуковыя працы А. Р. Мурашцы і дзевяці іншым найбольш актыўным выканаўцам у 1971 годзе была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

З 1963 года А. Р. Мурашка працуе ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна дацэнтам кафедры рускай мовы. Два гады (1978—1980) яна адначасова ўзначальвала кафедру рускай мовы для замежных навучэнцаў, двойчы на працяглыя тэрміны пасылалася для выкладання рускай мовы за мяжу: у ПНР (1971—1973) і на Кубу (1982—1984).

Выкладчыцкую дзейнасць А. Р. Мурашка ўвесь час паспяхова спалучае з даследчыцкай. Дыяпазон яе навуковых інтарэсаў даволі шырокі: узаемадзеянне беларускай мовы з рускай і іншымі суседнімі мовамі, пераклад твораў У. І. Леніна на беларускую мову, метэаралагічная лексіка беларускай мовы, выкладанне беларускай і рускай моў у вышэйшых навучальных установах. Кожнай з гэтых актуальных праблем Анцінея Рыгораўна прысвяціла рад змястоўных і цікавых артыкулаў. Яна ж з'яўляецца сааўтарам першых дзвюх частак створанага на кафедры вучэбнага дапаможніка для універсітэтаў Беларусі «Современный русский язык» (1979, 1981). Нельга не адзначыць удзелу Анцінеі Рыгораўны ў многіх рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных навуковых канферэнцыях і сімпозіумах, на якіх яна выступала з дакладамі і паведамленнямі.

Высокакваліфікаваны спецыяліст-мовазнавец і вопытны педагог, Анцінея Рыгораўна Мурашка карыстаецца сярод выкладчыкаў і студэнтаў заслужанай павагай. Калегі па працы, сябры і шматлікія вучні віншуюць яе з юбілеем і жадаюць ёй добрага здароўя, вялікага шчасця і новых творчых поспехаў.

**І. К. Германовіч**